УДК 821.161.3

# РЭАБІЛІТАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў ТВОРЧАСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА

**Банцэвіч П. К.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Для духоўнага жыцця сучаснага беларускага грамадства, якое перажывае сацыяльна-палітычныя, эканамічныя ды культурныя трансфармацыі, з'яуляюцца актуальнымі пошукі арыенціраў існавання і развіцця. Паўстае праблема не толькі рэфлексіі нацыянальнай культурнай спадчыны, але і яе высокапрафесійнай інтэрпрэтацыі на філасофскім, культуралагічным, гістарычным узроўнях і канструявання мадэлі беларускай культуры. Патрабуецца распрацоўка новай светапогляднай парадыгмы, мадэляванне эфектыўнага нацыянальнага міфа, што будзе спрыяць адраджэнню годнасці нацыі, яе кансалідацыі, усведамленню свайго гістарычнага прызначэння [3].

Узяўшы за аснову ідэю рэабілітацыі беларускай культурнай спадчыны, У. Караткевіч працаваў над вывадам з нябыту артэфактаў культуры, падзей, сюжэтаў, біяграфій, паданняў, традыцый і аднаўленнем іх жыццёвага сэнсу, значэння і каштоўнасці - у гэтым асветнік бачыў шлях да збліжэння гісторыі і сучаснасці, падмурак для дыялогу культур. Рэабілітацыя беларускай гісторыі і культуры павінна была, паводле У. Караткевіча, выканаць значную ролю ў беларускім адраджэнні. Гістарычныя творы празаіка спрыялі таму, каб «багатая і нармалёвая» гісторыя беларусаў стала фактам асабістага вопыту сучаснікаў: «Варты жалю той, хто не ведае былога дня і таму не можа разабрацца ў сённяшнім і прадбачыць будучы. Абыякавы да мінулага не мае ніякай інтэлектуальнай перавагі над жывёлай, і таму ёсць першы кандыдат на маральную, а затым і фізічную смерць. Усё адно хто гэта – чалавек ці народ» [1, с. 127].

У сваіх творах У. Караткевіч падае сучаснаму чытачу шырокую панараму гісторыка-культурнага і мастацка-эстэтычнага развіцця беларусаў, знаёміць з вобразамі славутых асоб, якія стаялі ля вытокаў беларускай духоўнасці і дзяржаўнасці, паказвалі прыклад альтруістычнага служэння радзіме, народу. Гэта людзі, што ўласнай патрыятычнай адданасцю, пакутніцкім жыццём упісалі свае імёны ў скрыжалі гісторыі: Е. Полацкая і К. Тураўскі, Ф. Скарына і М. Гусоўскі, П. Багрым і А. Міцкевіч, І. Буйніцкі і І. Грынявіцкі. Пісьменнік прагне напоўніць сэрцы сучаснікаў гонарам за сваіх вялікіх



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

суайчыннікаў, захапіць іх слыннымі асобамі мінулага. Мастак намагаўся зрабіць беларускую культуру цікавай для шырокай грамадскасці, папулярызаваў яе, пісаў пра найбольш творча адораных прадстаўнікоў беларускай зямлі, якімі да цяперашняга часу, у выніку гістарычнай недасведчанасці, ганарымся не мы, а іншыя народы.

Асэнсаванне свайго нацыянальнага ўкладу ў сусветную культуру лічылася, на думку У. Караткевіча пісьменніка, адной з асноўных задач: «Нам, беларусам, ёсць чым ганарыцца. Не менш, чым іншым» [2, с. 91]. Мастак сцвярджае, што беларусы маюць багатыя духоўныя ды матэрыяльныя набыткі, якія выходзяць далёка за межы сялянскай культуры, раскрывае для чытачоў вялікія дасягненні беларусаў у навуцы, літаратуры, мастацтве, юрыспрудэнцыі: «А Кірыла Тураўскі, а паданні? А тое, што наша друкаваная «Біблія» з᾽явілася раней, чым у многіх у Еўропе? А тое, што законы Статута Літоўскага склалі мы? А тое, што Польшча сто год судзілася законамі, напісанымі на нашай мове? А тое, што трыста год мовай княства была беларуская мова? А Будны? А старажытны іканапіс?!» [1, с. 169-170]. У.Караткевіч меў на мэце здзівіць суайчыннікаў, паказаць, што на Беларусі ёсць старажытныя замкі, храмы, палацы, разглядаў як сваю кроўную справу выданне шматтомнага «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», часопісу «Наш край», стварыў на тэлебачанні краіназнаўчую праграму «Спадчына», выступіў у якасці сцэнарыста і рэжысёра дакументальнага фільма «Памяць», змагаўся за адкрыццё Музея народнай архітэктуры і быту, пераконваў у неабходнасці шанавання памяці дзеячаў культуры, стварэнні на месцах, дзе яны нарадзіліся, музеяў і помнікаў, каб жыла неўміручасць [4].

Зварот пісьменніка да гераічнай гісторыі, да культурных здабыткаў мінулых пакаленняў, да тэмы шляхты, нацыянальнай эліты, інтэлігенцыі, вызначаў яго прагу здзейсніць пералом у грамадскай свядомасці, зрабіць пераацэнку ўстойлівых стэрэатыпаў наконт лёсу, менталітэту беларусаў, наконт самога паняцця «беларускі народ». У. Караткевіч разбураў антыміфы наконт таго, што беларусы – гэта народ без уласнай гісторыі і самабытнай культуры. Празаік, дыдактычна выяўляючы каштоўнасці высокага рангу, дэманстратыўна і гучна абвяшчаў: «Беларус – гэта чалавек высокага інтэлекту, маралі, шырокіх поглядаў, еўрапейскай культуры і адукаванасці, талерантны, верны свайму ідэалу. Беларускі народ духоўна багаты, мае паўнавартасную гераічную гісторыю, вялікую культуру, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне. Гэта «людзі з ганаровым мінулым, славе і мужнасці, розуму і таленту якіх могуць пазайздросціць вельмі і вельмі многія, і што толькі ад іх залежыць, каб гэтая слава тых, хто назаўсёды ішоў і ідзе



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

наперадзе, не прапала ў бягучых вяках, каб яны заўсёды былі поўныя высокай годнасці ў кожным слове і ў кожным учынку» [2, с. 204].

**ЛІТАРАТУРА**

1. Караткевіч У. Збор твораў: У 8 т. Т.5: Каласы пад сярпом тваім: Раман: У 2 кн. Кн. 2./ У.Караткевіч. - Мінск.: Маст. літ., 1990. – 494 с.
2. Караткевіч У. Збор твораў: У 8 т. Т.8: З жыццяпісу, нарысы, эсэ, публіцыстыка, постаці, крытычныя творы, інтэрв'ю, летапіс жыцця і творчасці: У 2 кн. Кн. 2 / У.Караткевіч. - Мінск.: Маст. літ., 1991. – 495 с.
3. Мальдзіс А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А.Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1990.– 229 с.
4. Уладыкоўская-Канаплянік, Л. М. Духоўныя ідэалы ў сучаснай культуры Беларусі і каштоўнасці глабалізму / Л. М. Уладыкоўская-Канаплянік. – Мн. : БДУ, 2009. – 198 с.

УДК 316.422

## ПРОБЛЕМЫ РАЗВИТИЯ СЕЛЬСКИХ ТЕРРИТОРИЙ: СОЦИОЛОГИЧЕСКИЙ АНАЛИЗ

**Блохин В. Н.**

УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия»
г. Горки, Республика Беларусь

Обновление экономических основ жизни общества, в частности сельских территорий, стало одной из основных задач в постсоветский период. Это связано с тем, что сельские территории играют ключевую роль в обеспечении продовольственной безопасности страны, решают наряду с городом стратегические вопросы расселения, сохраняют освоенные агроландшафты, способствуют сохранению этнокультурного разнообразия общества [1].

В деревне роль воздействия социальной сферы гораздо выше, что сказывается на системе мотивации, трудовом, демографическом и миграционном поведении крестьян. Многие социальные проблемы здесь обусловливаются разрывом между качеством жизни на селе и в городе. В сельских территориях затруднена трудовая мобильность из-за ограниченности рабочих мест; усилилась роль личных подсобных хозяйств; резко понижена мотивация на достижение, что существенно затрудняет целенаправленные преобразования. Малый процент населения проявляет интерес к предпринимательской деятельности, еще меньший – реально способен ее осуществлять [2].

Наличие названных проблем было подтверждено в ходе проведенного автором в 2015 г. социологического исследования методом анкетного опроса на тему «Динамика агропромышленного комплекса Беларуси».



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ